**Сцэнарый мерапрыемства з бацькамі ”Зберажом сваю спадчыну“**

Салаўёва Т.М., загадчык
ДУА ”Дзіцячы сад №3 г.Сянно“
Магучая Г.В., музычны кіраўнік
ДУА ”Дзіцячы сад №3 г.Сянно“

**Задачы:**

- фарміраваць у дзяцей станоўчыя адносіны да беларускай мовы;
- узбагачаць слоўнікавы запас;
- абуджаць у бацькоў любоў і павагу да сваёй краіны, роднай мовы, традыцый, народнай спадчыны, жаданне фарміраваць усё гэта і ў сваіх дзяцей.

**Ход мерапрыемства:**

*Гаспадар з гаспадыней і дзецьмі сустракае бацькоў.*

**Гаспадар:** Добры дзень, даражэнькія,
Дарослыя і маленькія.
Адчыню шырока дзверы,
Адчыніўшы – азірнуся,
Госцейкам пакланюся.

**Гаспадыня:** Сення рады мы сябрам,
Пачастуем ласкай,
Няхай сонца свеціць вам,
Як у добрай казцы.

***Гаспадар спявае песню”Чаму ж мне не пець“ (урывак).***

**Гаспадар:** Наша хата беларуская, старадаўняя, утульная, светлая ды прыгожая. Нездарма кажуць:”Свая хатка – як родная матка“. У хатах беларусаў спрадвеку прыемна пахла свежым хлебам, напаленай печкай, у якой патрэскваюць чырвонымі вугельчыкамі дровы.

***Песня*** ”***А ў печы жар-жар***,
На прыпечку дзіва,
Смажыць сала і бліны
Наша гаспадыня. **“**

**Дзіця:** Заўседы ля печы гаршкі, чыгункі,
Мурзатыя, пузатыя працаўнікі.
А побач вілы. Яны, быццам конь,
Носяць гаршкі, чыгункі ў агонь.

**Гаспадыня:** Печ-матухна і сагрэе, і накорміць. Ежу варылі ў чыгунку, яны былі розных памераў: і вялікія, і маленькія. А каб паставіць яго ў печ, карысталіся вілкамі або ўухватам. Прыбяраліся каля печы з дапамогай вось такога галенчыка.

Любілі беларусы піць гарбату, налівалі з самавару, асабліва пасля банькі.

**Гаспадар:** Ціха, цішэй, падыходзьце ўсе бліжэй,

Тут у люльцы лялька спіць,
Нельга нам яе будзіць.
Трэба нам усім разам устаць,
Калыханку заспяваць.

**Калыханка:** Люлі-люлі-люлі, прыляцелі гулі,
Селі на варотах у чырвоных ботых,
Пасыплю гарошку, каб паелі трошкі,
Ды пасыплю грэчкі,
Каб няслі яечкі.

**Дзіця:** Многа людзі працавалі:
Сеялі, палолі, рвалі,
Пралі пражу, кросны ткалі.
Выйшлі посцілкі на славу –
Хоць на ложак, хоць на лаву.

**Дзіця:** Спаднічку, фартушок, кашулю
Дачушцы вышыла матуля.
Каўнерык і манжэты на сарочку
Матуля вышыла сыночку.

**Дзіця:** А вось ручнік дарагі – вышываны берагі.
Кожны свой малюнак мае.
Хто ўмее, той чытае.
Вышывалі галубкоў
У той сям'і, дзе была любоў
І павага да бацькоў.

**Гаспадар:** Беларускі народ вельмі шануе сваю мову. Калі мы хочам, каб нас паважалі народы іншых краін, мы павінны ведаць сваю мову і ўмець размаўляць на ёй. Зараз я прапаную вам словы на рускай мове, а вы назавіце, як яно гучыць па-беларуску.

***Дыдактычная гульня"Назаві па-беларуску"***

**Хлопчык:** Беларусам нарадзіўся,
Беларусам буду жыць,
Беларускую зямельку
Буду вельмі я любіць.

**Гаспадыня:** Вялікае занчэнне у выхаванні дзяцей мае мастацкая літаратура. Напэўна, і вы ведаеце шмат казак. Зараз я прапаную вам наступнае заданне "З якой казкі? "

1. "Узяў дзед тапарок, паехаў у лясок, стук у дубок. Выскачыў з дуба каток – залаты лабок, залатое вушка, срэбраная шарсцінка, залатая лапка, срэбраная лапка." ("Каток – залаты лабок")
2. "Піліпка-сынок, плыві пад беражок, з'еш піражок. "("піліпка-сынок")
3. -"Добры дзень, пані! Як пані зваць-велічаць?

- Я муха-пяюха. А ты хто?
- А я па паліцах скрабатуха.“ (”Муха-пяюха“)

4. ”Настала вясна, прыгрэла сонца. Лісічкіна хатка растаяла, а зайкава стаіць, як стаяла. Прышла лісіца ў зайкаву хатку, выгнала зайку, а сама ў яго хатцы засталася.“( ”Хайкава хатка“)
5. – Хацеў бы я кожны дзень хлеб есці, але дзе мне яго даставаць? Парай, чалавеча!

- Добра, - кажа касец, - навучу цябе, дзе і як хлеб даставаць. (”Лёгкі хлеб“)

6. ”Коце, браце!
   Мяне ліска нясе
   У высокія горы,
   У глыбокія норы,
   Па барах, па карчах,
   Аж бярэ мяне страх! “(”Коцік, пеўнік і лісіца“)

**Гаспадар:** Любілі нашы продкі і святы. Любімае веснавае свята беларусаў – Вялікдзень.

**Гаспадыня:** Вялікдзень – самае значнае і прыгожае свята. На Вялікдзень родныя і знаёмыя віталіся, не так, як звычайна, а словамі ”Хрыстос уваскрэс! “. У адказ чулі: ”Сапраўды ўваскрэс!“. Затым тройчы цалаваліся, частавалі яйкамі, булкамі, цукеркамі, спявалі песні.

*Дзеці спяваюць песню” Сёння ў нас свята“.*

**Гаспадар:** На гэты дзень існуе шмат павер’яў. Раніцай усе дзеці і дарослыя павінны мыцца так, каб кропелькі вады не траплялі на падлогу. Пасля мыцця абавязкова пакатаць яйка па твары, каб заўсёды быў чыстым.

А вось і велікодная лялька. Традыцыйна народную велікодную ляльку Вербніцу (Вялікдзень) выконвалі ў чырвоным колеры, якое сімвалізуе адраджэнне і радасць. Прычым твар лялькі таксама павінен быць чырвонага колеру. Апраналі Вербніцу ў святочным строі з перавагай чырвонага колеру.

Рабілі такую ляльку сваімі рукамі за тыдзень да Вялікдня (напярэдадні Вербнай нядзелі). Вербніцу выстаўлялі на акно, каб людзі бачылі, што ў гэтым доме праз тыдзень будуць святкаваць Вялікдзень. На само свята ляльку ставілі на стол побач з велікоднымі стравамі кулічом і фарбаванымі яйкамі.

**Гаспадыня:** Ці ведаеце вы, што з’яўляецца адным з галоўных прадметаў на Вялікдзень?

**Гаспадар:** Правільна, яйка. Лічаць, што вось гэта частка яйка (паказвае на”тупую“ вяршыню) нагадвае круглы купал неба, а ніжняя (паказвае на “вострую” вяршыню) замыкае свет наземны. Вось якое наша яйка, ад неба да зямлі.

А колькі смачных страў з яек можна прыгатаваць!

Гульня ”Назаві стравы з яек“

**Гаспадыня:** Гульня”Закончы сказ“

1. Яйка курыцы ……. не вучыць
2. Сядзіць, як…… курыца на яйках.
3. Носіцца, як ……..курыца з яйцом.
4. Да пяці год пестуй дзіця, як яечка,
   Тады выйдзе з яго……..чалавечка.

**Гаспадар:** У такое вялікае свята мы пачастуем вас не простымі яйкамі, а велікоднымі, шчасця вам, багацця! Свята ў кожнай хаце!

Гаспадыня выходзіць разам з дзецьмі.

**Гаспадар:** Акрамя Велікоднай лялькі ў нашым музеі ёсць шмат іншых лялек. Лялькі не заўсёды лічыліся выключна дзіцячымі цацкамі. Нашы продкі - старажытныя славяне надавалі такому ручному вырабу асаблівае значэнне і называлі іх лялькамі абярэгамі.

Падобныя вырабы былі закліканы абараняць хату і ўсю сям'ю ад розных цёмных сіл, кожнаму выпадку адпавядала свая лялька. Такія славянскія вырабы былі ў некалькіх адзінках ў кожнай хаце і часцей за ўсё іх перадавалі па спадчыне як каштоўную рэліквію.

Нашы продкі верылі, што абярэжныя лялькі маглі лёгка адвесці сурокі і псуту, вылечыць хворага і абараніць слабага. Славянскія лялькі ахоўвалі дом і днём і ноччу ад усялякіх няшчасцяў. Выконваліся яны ў розным выкананні, у залежнасці ад уменняў вытворцы і ім прыпісваліся ахоўных функцый. Але існавала і адна агульная для ўсіх лялек рыса: яны ніколі не мелі твару. Гэты факт тлумачыўся тым, што набываючы рысы і становячыся паўнавартаснай лялькай, яна магла падвергнуцца ўздзеянню чорных сіл. Гэта, у сваю чаргу, значна зніжала ахоўныя ўласцівасці абярэга і прывязвала такую ляльку да гэтага чалавека.

Кожнаму святу і важнай падзеі ў жыцці любога чалавека адпавядала свая лялька, якая абавязкова павінна была прысутнічаць у доме.

*Аповед гаспадара пра лялькі-абярэгі.*

*Лялька, як падарунак для гасцей.*

**Гаспадар:** Хопіць нам ужо, сябры,
Спяваць ды смяяцца,
Трэба зараз нам, сябры,
З вамі развітацца.

*Гучыць музыка “Мы Вам жадаем …”.*